УДК 903.21

**А. Д. Гаршкоў**
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Ажэшка, 22,
230023 Гродна, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 863 72 04, ales.harshkou.arch@gmail.com

# КУЛЬТУРНА-ХРАНАЛАГІЧНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ГРУПЫ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ КАЛЯ В. БАЛЯ СОЛЬНАЯ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ 1975 ГОДА)

Ва ўводзінах вызначаны аб’ект даследавання — культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя археалагічных матэрыялаў, атрыманых Міх. М. Чарняўскім падчас археалагічнай разведкі каля в. Баля Сольная (Гродзенскі раён) у 1975 годзе. Актуальнасць даследавання абумоўлена адсутнасцю спецыяльных работ па дадзеным помнікам, а таксама блытанінай у нумарацыі і іх інтэрпрэтацыі. Прадстаўлена гісторыя даследаванняў помнікаў у дадзенай мясцовасці, праблема іх нумарацыі і інтэрпрэтацыі.

У асноўнай частцы артыкула разглядаюцца калекцыі, атрыманыя Міх. М. Чарняўскім падчас разведак у 1975 годзе каля вышэйназванага населенага пункта. Праведзены тэхніка-марфалагічны аналіз крамянёвых матэрыялаў, іх графічная (часткова) і фотафіксацыя. На аснове выяўленых асаблівасцей тэхналогіі апрацоўкі крэменю вызначана культурна-храналагічная прыналежнасць прадметаў. У частцы, прысвечанай дыскусіі, прадстаўлены разважанні аб тым, чаму атрымалася блытаніна ў нумарацыі помнікаў, а культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя адрозніваецца ў літаратуры.

Вынікі дадзенага даследавання могуць быць прыменены пры вывучэнні першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі і ў сферы аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей нашай краіны.

**Ключавыя словы:** фінальны палеаліт; каменны век; крамянёвы інвентар; нуклеус; чаранковыя наканечнікі стрэл; культура броме-лінгбі; валкушанская культура.

Бібліягр.: 14 назв.

**A. D. Harshkou**
Yanka Kupala State University of Hrodna, 22 Azheshko Str., 230023 Hrodna,
the Republic of Belarus, +375 (29) 863 72 04, ales.harshkou.arch@gmail.com

# CULTURAL AND CHRONOLOGICAL IDENTIFICATION OF THE GROUP OF ARCHAEOLOGICAL SITES NEAR V. BALYA SOLNAYA, HRODNA DISTRICT (BASED ON THE MATERIALS OF 1975)

The introduction defines the object of research — the cultural and chronological interpretation of archaeological materials obtained by Mikh. M. Charnyawski during archaeological exploration near the village of Balya Solnaya (Hrodno region) in 1975. The relevance of the study is due to the lack of special works on these sites, as well as confusion in numbering and their interpretation. The history of the study of sites in the area and the problem of their numbering and interpretation are presented.

The main part deals with the collections obtained by Mikh. M. Charnyawski during reconnaissance in 1975 near the above-named settlement. Technical and morphological analysis of flint materials and their graphic and photographic fixation were carried out. Based on the features of the flint processing technology, the cultural-chronological belonging of the materials was determined. In the part dedicated to the discussion, arguments are presented on why there was confusion in the numbering of sites, and the cultural and chronological interpretation differs in the literature.

© Гаршкоў А. Д., 2023

The results of this research can be applied to the study of the primitive society on the territory of Belarus and in the field of protection of the historical and cultural heritage of our country.

**Key words:** final Paleolithic; Stone Age; flint implements; core; arrowheads; Bromme-Lingby culture; Volkushan culture.
Ref.: 14 titles.

**Уводзіны.** Вёска Баля Сольная знаходзіцца на паўночным захадзе ад г. Гродна, на левым беразе р. Нёман, на тэрыторыі Падлабенскага сельскага савета Гродзенскага раёна (малюнак 1). У 1958 годзе каля дадзенага населенага пункта праводзіў разведкі Л. С. Клейн, падчас якіх былі выяўлены 2 помнікі археалогіі [1, с. 16]. Пасля, у 1975 годзе, у гэтай мясцовасці працы праводзіў Міх. М. Чарняўскі. Ён адкрыў 3 помнікі і распачаў новую нумарацыю (Баля Сольная-1—3) [2, с. 5—6]. Менавіта гэтая нумарацыя з пэўнымі змяненнямі выкарыстоўваецца ў літаратуры зараз [3—4]. Блытаніна з нумарамі помнікаў, а дакладней — працяг нумарацыі не па справаздачы, а па «Збору помнікаў гісторыі і культуры...», прывёў да таго, што ў 2012 годзе В. Л. Лакіза адкрыў «новы» помнік у ваколіцах в. Баля Сольная, які назваў Баля Сольная-3 [5, с. 232—233]. Аўтарам гэтага артыкула выкарыстоўваецца нумарацыя, прапанаваная ў справаздачы за 1975 год Міх. М. Чарняўскім.




**Малюнак 1. — Месцазнаходжаннее в. Баля Сольная (Гродзенскі раён)**

Цікавасць да матэрыялаў, сабраных у ваколіцах в. Баля Сольная, звязана з тым, што шэраг артэфактаў, перш за ўсё наканечнік стралы з помніка Баля Сольная-2, падаецца некаторымі навукоўцамі як доказ прысутнасці ў познеледавіковы час у дадзенай мясцовасці носьбітаў культуры броме-лінгбі, якія пранiклі на нашы абшары аднымі з першых [6—9]. Але аднясенне крамянёвых артэфактаў, зафіксаваных на гэтым помніку, да вышэйназванай культурнай адзінкі выклікае пэўныя пытанні. Таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз і культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя крамянёвых матэрыялаў, атрыманых Міх. М. Чарняўскім падчас даследаванняў у 1975 годзе каля в. Баля Сольная Гродзенскага раёна.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Акрамя агульнагістарычных метадаў (аналіз, сінтэз) падчас працы з артэфактамі былі задзейнічаны ўласна археалагічныя. Пры апісанні крамянёвага інвентару выкарыстоўваліся тэхніка-марфалагічны і тыпалагічны метады, якія дазволілі атрыбутаваць матэрыялы і вызначыць іх культурна-храналагічную прыналежнасць.

Матэрыяламі даследавання з'яўляюцца калекцыі крамянёвых прадметаў, сабраных Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе каля в. Баля Сольная, якія захоўваюцца ў фондах Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Іх апісанне, разам з лакалізацыяй месцаў даследаванняў і гісторыяй іх вывучэння, пададзены ніжэй.

***Баля Сольная-1.*** Помнік размешчаны на мысе, утвораным левым берагам (высокай тэрасай) р. Нёман і левым берагам р. Зарэчанка (мясцовая назва — Рэчка), праз 0,3—0,35 км на паўночны захад да вёскі. Прыкладная вышыня помніка над вадой — 6,5 м.

Помнік быў адкрыты Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе. У 2011 і 2012 гадах абследаваўся В. Л. Лакізай [2, с. 5; 5, с. 231]. На схіле тэрасы каля плота хаты, побач са студняй, В. Л. Лакізай быў закладзены шурф № 1 (3 м$^2$). Выразны культурны пласт не зафіксаваны. Шурф даследаваўся да глыбіні 0,7 м [5, с. 231].

Крамянёвы інвентар, сабраны Міх. М. Чарняўскім на помніку, паводле справаздачы, складаецца з нуклеуса аднапляцовачнага і адшчэпаў. На жаль, папрацаваць з гэтымі матэрыяламі нам не ўдалося, так як дакладнае месца захавання невядомае.

***Баля Сольная-2.*** Помнік размешчаны на левым беразе р. Нёман, пры ўпадзенні р. Зарачанка, на ўступе першай тэрасы. Прыкладная вышыня над узроўнем вады — каля 4 м.

Помнік быў адкрыты Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе, у 2011 і 2012 гадах даследаваўся В. Л. Лакізай [2, с. 5; 5, с. 232—233]. Падчас разведкі ў 1975 годзе была зроблена зачыстка берага р. Зарачанка, дзе ў пласце светла-шэрага пяску з жаўтаватым адценнем былі зафіксаваны артэфакты [2, с. 5].

У 2012 годзе на помніку былі закладзены 2 шурфы. Першы (3 м$^2$) знаходзіўся на высокай тэрасе р. Нёман. У ім быў зафіксаваны культурны пласт магутнасцю да 0,6 м, аналагічны па стратыграфіі зачысткі 1975 года. У шурфе № 2 (3 м$^2$), які быў размешчаны на надпойменнай тэрасе р. Нёман, напластаванні у асноўным складаліся з буйназярністага пяску і жвіровых адкладаў [5, с. 232—233].

Падчас даследаванняў 1975 года былі знойдзены 4 крамянёвыя артэфакты, якія захоўваюцца ў фондах Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (удалося апрацаваць толькі 3): медыяльная частка пласціны (малюнак 2, *2*); адшчэп рэтушаваны (*гл.* малюнак 2, *3*); адыстальная пласціна рэтушаваная (*гл.* малюнак 2, *1*).

Гэтыя знаходкі зроблены са светла-шэрага і шэрага крэменю, сыравіна гладкая навобмацак і празрыстая на прасвет. Жаўлачная скарынка, крэйдавая, прысутнічае на двух артэфактах. Паціна адсутнічае.

У тэхналагічным плане можна адзначыць, што зняцце дадзеных артэфактаў з нуклеусаў адбывалася пры дапамозе прамога ўдару, магчыма, каменным адбойнікам. Пяткі ў артэфактаў, у якіх яны захаваліся, фасеткаваныя. Апрацоўка карніза зафіксавана толькі ў адным выпадку.




**Малюнак 2. — Матэрыялы з калекцыі помніка Баля Сольна-2**

*Заўвага*. Малюнкі і фотаздымкі аўтара.

***Баля Сольная-3.*** Помнік размешчаны на мысе, утвораным левым берагам р. Нёман і правым берагам р. Зарачанка, на ўскраіне вёскі. Прыкладная вышыня над узроўнем вады — 9 м.

Стаянка была адкрыта Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе. Матэрыялы з помніка былі выкарыстаны В. С. Абухоўскім у сваёй магістарскай працы і апублікаваны ў 2009 годзе [2, с. 5—6; 10, s. 42; 9, s. 27]. У 2011 і 2012 гадах помнік, верагодна, абследаваўся В. Л. Лакізай [5, с. 231—232]. У шурфе № 1 (3 $м^2$), закладзеным у 2012 годзе, В. Л. Лакізам адзначана, што пласт жаўтавата-шэрага пяску быў інтэнсіўна насычаны крамянёвымі знаходкамі [8, с. 231—232].

У фондах Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваецца калекцыя з 85 крамянёвых артэфактаў, сабраных Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе, апісанне якой прадстаўлена ніжэй.

***Нуклеусы.*** Усяго на помніку было выяўлена 9 цэлых і 4 рэшткавыя фрагменты нуклеусаў. У залежнасці ад колькасці пляцовак, былі вылучаны наступныя формы: адна-, двух- і шматпляцовачныя (малюнак 3, *1—3*).

*Нуклеусы аднапляцовачныя* — 7 адзінак. Контрфронт і бакі апрацаваныя або апрацаваныя часткова (6 адзінак). Пляцоўка сфармавана 1 сколам. У 4 выпадках плоскасць сколвання размешчана на шырэйшым плашчаку жаўлака, у 1 выпадку яна скругленая. У 2 экзэмпляраў прасочваецца апрацоўка ці рэдукаванне карніза. Працоўныя вуглы: ад 83 да 90°. Памеры: даўжыня — ад 4,3 да 9,7 см; шырыня — ад 3,1 да 7,1 см; таўшчыня — ад 1,8 да 6,7 см (малюнак 3, *1, 3*).

*Нуклеус двухпляцовачны* — 1 адзінка. Монафрантальны, контрфронт апрацаваны часткова. Пляцоўкі сфармаваныя адзінарнымі сколамі, плоскасць сколвання скругленая. Апрацоўка карніза не прасочваецца. Працоўны вугал — 89°. Памеры: даўжыня — 6,2 см; шырыня — 3,2 см; таўшчыня — 2,0 см (*гл.* малюнак 3, *2*).

*Нуклеус шматпляцовачны* — 1 адзінка. Вугал сколвання — 89°. Памеры: даўжыня — 4,1 см; шырыня — 2,4 см; таўшчыня — 3,3 см.

*Рэшткавыя фрагменты нуклеусаў* — 4 адзінкі. Паходзяць ад аднапляцовачных экзэмпляраў. На адным фрагменце прысутнічае паўстромкая нерэгулярная рэтуш. У адным выпадку пляцоўка, верагодна, была сфармавана некалькімі сколамі. Памеры: даўжыня — ад 4,5 да 8,6 см; шырыня — ад 2,0 да 4,1 см; таўшчыня — ад 1,8 да 2,5 см.




**Малюнак 3. — Матэрыялы з калекцыі помніка Баля Сольная-3**

*Заўвага*. Малюнкі В. С. Абухоўскага *(1)* і аўтара *(2—4)*.

***Тэхналагічна вызначальныя сколы.*** Да гэтай катэгорыі артэфактаў аднесены падрабрыстыя пласціны і фрагмент падрабрыстай пласціны, сколы падпраўкі і аднаўлення ўдарнай пляцоўкі, сколы падпраўкі і аднаўлення плоскасці сколвання нуклеусаў.

*Падрабрыстыя пласціны* — 7 адзінак. Дадзеная група складаецца з 6 цэлых артэфактаў і фрагмента. Сляды жаўлачнай скарынкі ўтрымліваюць 4 артэфакты. У знаходак з захаванымі праксімальнымі часткамі вылучаюцца наступныя тыпы пятак: гладкія (1 адзінка); фасеткаваныя (2 адзінкі); кропкавыя (2 адзінкі). У 4 падрабрыстых пласцінах чытаецца апрацоўка карніза. Пяропадобнае заканчэнне прасочваецца на ўсіх артэфактах з захаванай дыстальнай часткай (5 адзінак). На 3 артэфактах дадзенага тыпу прысутнічае паўстромкая нерэгулярная рэтуш на спінцы (1 адзінка) і брушку (2 адзінкі). Метрычныя паказчыкі наступныя: даўжыня — ад 3,1 да 7,9 см; шырыня — ад 1,1 да 4,6 см; таўшчыня — ад 0,3 да 1,9 см.

*Сколы аднаўлення ўдарнай пляцоўкі нуклеусаў і іх фрагменты* — 4 адзінкі. Артэфакты былі атрыманы ў выніку поўнага зняцця пляцоўкі нуклеуса ўдарам з боку плоскасцей сколвання. На пятках прысутнічаюць негатывы, атрыманыя падчас эксплуатацыі ядрышча. У адным выпадку пляцоўка была скругленая, прасочваецца апрацоўка карніза. Верагодна, скол утварыўся ад нуклеуса, з якога атрымоўвалі пласціны. Памеры наступныя: даўжыня — ад 3,8 да 5,5 см; шырыня — ад 3,1 да 5,7 см; таўшчыня — ад 1,4 да 2,3 см.

*Сколы падпраўкі ўдарнай пляцоўкі нуклеусаў і іх фрагменты* — 2 адзінкі. Артэфакты былі атрыманы ў выніку частковага зняцця пляцоўкі ўдарам з боку фронта нуклеусаў. Пяткі ва ўсіх артэфактах нясуць сляды негатываў сколванняў. Хутчэй за ўсё, паходзяць ад нуклеусаў ад пласцін, пра што кажуць негатывы папярэдніх сколаў на фронце сколвання, якія захаваліся фрагментарна. Памеры наступныя: даўжыня — 3,2/5,7 см; шырыня — 3,1/5,7 см; таўшчыня — 1,3/2,13 см.

*Скол аднаўлення плоскасці сколвання і іх фрагменты* — 1 адзінка (*гл.* малюнак 3, *4*). У калекцыі захоўваецца адшчэп, з дапамогай якога быў зняты цалкам фронт сколвання нуклеусаў. Пятка ў артэфакта гладкая, прысутнічае невыразная апрацоўка карніза. Верагодна, скол паходзіць ад двухпляцовачнага нуклеуса. Памеры: даўжыня — 4,5 см; шырыня — 5,6 см; таўшчыня — 1,2 см.

*Сколы падпраўкі плоскасці сколвання і іх фрагменты* — 2 адзінкі. У адрозненні ад папярэдняй катэгорыі, сюды былі аднесены адшчэпы, з дапамогай якіх была знятая большая частка фронта сколвання нуклеусаў. На дарсальнай паверхні прысутнічаюць некалькі негатываў папярэдніх сколаў. Пяткі ў артэфактаў гладкія. Памеры сколаў: даўжыня — 4,3/7,5 см; шырыня — 2,7/4,3 см; таўшчыня — 1,1/2,3 см.

***Дэбітаж.*** Прадукты расшчаплення прадстаўлены наступнымі групамі артэфактаў: пласціны і фрагменты пласцін, адшчэпы і фрагменты адшчэпаў, лускавінкі.

*Пласціны і фрагменты пласцін* — 5 адзінак (малюнак 4, *2*). Дадзеныя экзэмпляры былі зняты з аднапляцовачных нуклеусаў, прасочваецца ўдарны бугарок, заканчэнне пяропадобнае. Пяткі фасеткаваныя, прысутнічае апрацоўка карніза. Вугал сколвання — ад 81 да 89°. Метрычныя паказчыкі наступныя: даўжыня — ад 4,5 да 8,6 см; шырыня — ад 2,3 да 4,3 см; таўшчыня — ад 0,5 да 1,0 см.

*Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў* — 9 адзінак. Сярод адшчэпаў былі вылучаны падскарыністыя (7 адзінак), без слядоў жаўлачнай скарынкі (2 адзінкі). Па тыпах пяткі прадметы дзеляцца наступным чынам: скарыністыя (2 адзінкі), гладкія (2 адзінкі), фасеткаваныя (2 адзінкі), кропкавая (2 адзінкі). На адным экзэмпляры прасачыць пятку не атрымалася. Рэдукаванне прысутнічае толькі на адным сколе. Пяропадобнае заканчэнне маюць 4 знаходкі, у 3 — петлепадобнае. Вугал сколвання — ад 75 да 87°. Памеры знаходак: даўжыня — ад 2,1 да 7,2 см; шырыня — ад 0,7 да 4,2 см; таўшчыня — ад 0,3 да 1,7 см.




**Малюнак 4. — Матэрыялы з калекцыі помніка Баля Сольная-3**

*Заўвага*. Малюнкі В. С. Абухоўскага *(1, 3—4)* і аўтара *(2, 5)*.

***Прылады працы.*** Гэтая катэгорыя прадстаўлена 43 артэфактамі: адшчэпамі рэтушаванымі і фрагментамі адшчэпаў рэтушаваных, пласцінамі рэтушаванымі і фрагментамі пласцін рэтушаваных, разцамі, праколкай, скрабачом, чаранковым наканечнікам стралы, цяслам, долатам, сякерай, нарыхтоўкамі біфасіяльных вырабаў, фрагментамі прылад нявызначаных. Асобна трэба адзначыць знаходкі крэсіўных крэмняў.

*Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты адшчэпаў* — 22 адзінкі (*гл.* малюнак 4, *5*). Дадзеная група прадстаўлена скарыністым, 15 падскарыністымі і 6 адшчэпамі без слядоў жаўлачнай скарынкі. Апрацоўка карніза адсутнічае ў 19 адзінак, пяткі гладкія (3 адзінкі), фасеткаваныя

(5 адзінак), сфармаваныя на натуральнай паверхні (6 адзінак). На ўсіх артэфактах прысутнічае ўдарны бугарок, трэшчыны, на некаторых — заганцы. Сярэдні вугал сколвання набліжаны да 88,5°. Рэтуш нерэгулярная, паўстромкая, размешчана па баках артэфактаў на вентральнай і дарсальнай паверхнях. Памеры артэфактаў: даўжыня — ад 2,0 да 7,3 см; шырыня — ад 1,5 да 4,4 см; таўшчыня — ад 0,4 да 2,0 см.

*Пласціны рэтушаваныя і фрагменты пласцін* — 5 адзінак (*гл.* малюнак 4, *1*). У групу ўваходзяць падскарыністыя пласціны, знятыя з аднапляцовачных(?) нуклеусаў. У іх прасочваецца паўстромкая рэтуш на вентральным і дарсальным баках. Апрацоўка карніза прысутнічае ў 2 пласцінах. Пяткі захаваліся ў 4 выпадках — гладкія (2 адзінкі) і фасеткаваныя (2 адзінкі). Прысутнічае ўдарны бугарок, заганец, пяропадобнае заканчэнне, трэшчыны. Адна з пласцін, у якой сфармаваная выемка ў дыстальнай частцы, верагодна, з’яўляецца нарыхтоўкай разца. Вугал сколвання — каля 88—89°. Памеры: даўжыня — ад 5,6 да 7,6 см; шырыня — ад 2,0 да 3,6 см; таўшчыня — ад 0,5 да 1,2 см.

*Наканечнік* — 1 адзінка. У якасці нарыхтоўкі выкарыстана пласціна, знятая з двухпляцовачнага нуклеуса (*гл.* малюнак 3, *4*). Вастрыё сфармавана ў дыстальнай частцы, чаранок аформлены ў праксімальнай частцы стромкай рэтушшу на дарсальным баку і адламаным ударным бугарком. На целе наканечніка прысутнічае паўстромкая рэтуш. Памеры: даўжыня — 5,0 см; таўшчыня — 1,8 см; таўшчыня — 0,8 см.

*Разец* — 1 адзінка. У калекцыі прысутнічае рэтушны бакавы разец, выкананы на адшчэпе. Пятка гладкая, прысутнічае ўдарны бугарок і трэшчыны. Працоўная грань прылады сфармаваная разцовым сколам, а таксама паўстромкай і стромкай рэтушшу на дыстальнай частцы нарыхтоўкі з вентральнага боку. Вугал сколвання — 87°. Памер артэфакта: даўжыня — ад 3,7 да 8,1 см; шырыня — ад 2,6 да 4,3 см; таўшчыня — ад 1,1 да 2,0 см.

*Скрабач* — 1 адзінка. Да гэтай групы аднесены адшчэп, які апрацаваны па баках стромкай «скрабковай» рэтушшу. Памеры: даўжыня — 2,2 см; шырыня — 3,1 см; таўшчыня — 1,1 см.

*Праколка* — 1 адзінка. У якасці нарыхтоўкі выкарыстаны падскарыністы адшчэп (*гл.* малюнак 4, *3*). Джала аформлена ў дыстальнай частцы нарыхтоўкі стромкай рэтушшу на дарсальным баку. Апрацоўка карніза не прасочваецца, пятка гладкая. Вугал сколвання — 89°. Памеры: даўжыня — 4,2 см; шырыня — 2,0 см; таўшчыня — 0,5 см.

*Нарыхтоўкі біфасіяльных вырабаў* — 3 адзінкі. Гэтая група прадстаўлена двухбаковаапрацаванымі незавершанымі прыладамі (малюнак 5, *3—4*). Памеры: даўжыня — 7,0/5,0/3,1 см; шырыня — 4,5/3,0/2,3 см; таўшчыня — 2,0/1,5/1,2 см.

*Долата або цясла* — 1 адзінка. Прылада выканана на фрагменце падскарыністага адшчэпа (*гл.* малюнак 5, *2*). Прамакутная форма анфаса дасягнутая шляхам апрацоўкі бакоў стромкай дарсальнай рэтушшу і сколам(і) (?). Папярочнае сячэнне падпрамавугольнае, прадольнае сячэнне ў выглядзе дваякавыпуклай усечанай лінзы. Лязо злёгку ўвагнутае, паўтарае форму адшчэпа. Памеры: даўжыня — 4,3 см; шырыня — 1,9 см; таўшчыня — 1,5 см.

*Сякера* — 1 адзінка. Траншэпадобная сякера, выкананая на адшчэпе (*гл.* малюнак 5, *1*). Апрацоўка у асноўным уніфасіяльная, паўстромкая рэтуш па краі. Форма анфаса — няправільная трапецыя. Папярочнае сячэнне ў выглядзе дваякавыпуклай лінзы, прадольнае — дваякавыпуклай лінзы са злёгку ўсечанымі канцамі. Памеры: даўжыня — 4,5 см; шырыня — 4,0 см; таўшчыня — 1,5 см.

*Крэсіўныя крэмені* — 2 адзінкі. Дадзеная група артэфактаў выдзелена паводле формы негатываў знятых фасетак, якія характэрны для ўдараў жалезным прадметам (крэсівам) і моцнай справанасці краёў. Сляды выкарыстання маюць нерэгулярны характар і прасочваюцца з вентральнага і дарсальнага бакоў на 2 экзэмплярах. Памеры: даўжыня — 2,3/4,2 см; даўжыня — 2,1/2,4 см; таўшчыня — 0,9/1,2 см.

*Фрагменты прылад нявызначаных* — 4 артэфакты. Дадзеныя знаходкі ўяўляюць сабой дробныя фрагменты прылад, памеры якіх не дазваляюць больш дакладна акрэсліць тыпалагічнае вызначэнне.




**Малюнак 5. — Матэрыялы з калекцыі помніка Баля Сольная-3**

*Заўвага*. Фотаздымкі аўтара.

***Тэхналагічныя характарыстыкі крамянёвай калекцыі.*** *Тэхналогія першаснага расшчаплення.* Фарміраванне нуклеусаў пачыналася з адбіцця выступаючых частак канкрэцый (пры неабходнасці) памерамі ад 4,1 да 9,3 см. Далей бакавым сколам адбывалася выдаленне меншай або меншых частак, у выніку чаго ўтвараліся ўдарная(ыя) пляцоўка(і). Але трэба адзначыць, што сярод пласцін і адшчэпаў прысутнічаюць экзэмпляры, якія маюць фасеткаваную паверхню пятак, што можа казаць пра фарміраванне пляцоўкі або пляцовак некалькімі сколамі. Далей, хутчэй за ўсё, адбывалася фарміраванне рабрыны шляхам апрацоўкі жаўлака (наданне яму, часцей за ўсё, прызматычнай формы), пасля чаго пачыналася зняцце сколаў-нарыхтовак. Рабрыстыя пласціны ў калекцыі адсутнічаюць, але прысутнічаюць падрабрыстыя, а колькасць скарыністых і падскарыністых невялікая.

Контрфронт і бакі нуклеусаў у большасці выпадкаў апрацоўваліся цалкам або часткова. Для фарміравання большага вугла паміж плоскасцю сколвання і ўдарнай пляцоўкай апошняя падпраўлялася або аднаўлялася зняццем адшчэпа, часам — з боку фронта нуклеуса. Аналагічна пры тэхналагічнай патрэбе падпраўлялася або аднаўлялася плоскасць сколвання моцным ударам з боку ўдарнай пляцоўкі.

Эксплуатацыя нуклеусаў, хутчэй за ўсё, вялася з дапамогай прамога ўдару пры выкарыстанні мяккага (арганічнага або неарганічнага) адбойніка. Прыкметы дадзенай тэхналогіі прасочваюцца перш за ўсё на пласцінах. Яны маюць гладкую, фасеткаваную або кропкавую пятку скола, далікатны ўдарны бугарок (або ён увогуле адсутнічае). Заганцы і трэшчыны звычайна не фіксуюцца. Прасочваецца апрацоўка (рэдукаванне, выраўніванне) карніза нуклеуса. У некаторых фрагментах пласцін — правільнае трапецападобнае сячэнне. Заканчэнне ў дыстальных частак нарыхтовак у большасці выпадкаў пярападобнае. Значэнні вугла сколвання маюць сярэднія паказчыкі — 85°.

У той жа момант адзін з аднапляцовачных нуклеусаў мае іншыя тэхналагічныя асаблівасці (*гл.* малюнак 3, *1*). Пляцоўка нуклеуса мае 2 зоны: актыўную (сфармаваная некалькімі сколамі) і пасіўную (сфармаваная адным сколам). Плоскасць сколвання сфармавана на найбольш вузкім баку жаўлака. Контрфронт і бакі апрацаваныя. З нуклеуса атрымоўвалі пласціны з дапамогай пасярэдніка ці адціскальніка.

Эксплуатацыя нуклеуса шматпляцовачнага ад адшчэпаў, хутчэй за ўсё, вялася з дапамогай цвёрдага адбойніка шляхам прамога ўдару без дадатковай апрацоўкі.

У дадзенай калекцыі сярод сколаў большасць складаюць адшчэпы (51,2 %). Гэта звязана з вельмі сыравінаёмістай тэхналогіяй фінальнапалеалітычных культур. Не выключна і тое, што частка адшчэпаў мае другую храналагічную прыналежнасць. Але асноўным відам нарыхтовак былі пласціны, што добра прасочваецца на нуклеусах, негатывах пласцін і адшчэпаў, прыладах з калекцыі. Тэхналагічныя аспекты атрымання пласцін цалкам супадаюць з апісаннем вышэй. Абсалютная большасць сколаў, у якіх захаваліся дыстальныя часткі, маюць пярападобнае заканчэнне. Петлепадобнае заканчэнне сустракаецца ў невялікай колькасці сярод пласцін, а таксама пераважна ў буйных адшчэпаў. Прыступкавае заканчэнне зафіксавана толькі ў 2 экзэмплярах.

*Тэхналагічныя асаблівасці вырабу прылад.* Прылады працы ў калекцыі складаюць 16,4 %, некаторыя з іх адносяцца да эпохі неаліту — бронзавага веку. Асноўную частку іх складаюць пласціны і адшчэпы рэтушаваныя. Разцы прадстаўлены рэтушным бакавым экзэмплярам, выкананым на адшчэпе, дыстальная частка якога была скошана паўстромкай дарсальнай рэтушшу, пасля з аднаго края быў зняты разцовы скол.

Наканечнік стралы быў выкананы на пласціне, знятай з двухпляцовачнага монафрантальнага нуклеуса. Тэхналагічныя асаблівасці атрымання пласціны і афармлення чаранка наканечніка кажуць аб іншай яго культурнай прыналежнасці — да валкушанскай/краснасельскай культуры.

Праколка ў вывучанай калекцыі толькі адна. Яна выканана на адшчэпе, аформленым паўстромкай рэтушшу з вармальнага боку — джалам.

Скрабачы, біфасіяльныя прылады і іх нарыхтоўкі, долата/цясла, крэсіўныя камяні адносяцца да больш позніх эпох (неаліту — бронзавага веку, Сярэднявечча — Новага часу).

Гэтыя матэрыялы выкананы з светла-шэрага, шэрага і цёмна-шэрага крэменю, гладкага навобмацак і празрыстага на прасвет. Жаўлачная скарынка, крэйдавая, прысутнічае на 36 % артэфактаў. Паціна прысутнічае на 5 артэфактах.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Прааналізаваўшы дадзеныя матэрыялы, паўстае пытанне, чаму сярод прадметаў з помніка Баля Сольная-2 узгадваюцца фінальнапалеалітычныя матэрыялы, на падставе якіх прыкмет яны адносяцца да культуры броме-лінгбі [6—9]. З вышэйпададзенага апісання матэрыялаў вынікае, што яны маюць іншую культурную прыналежнасць. На наш пункт гледжання, прычына ў наступным: пры падрыхтоўцы «Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» па Гродзенскай вобласці была пададзена інфармацыя толькі пра 2 помнікі з наваколля в. Баля Сольная, прычым помнік пад назвай Баля Сольная-1 (па справаздачы Міх. М. Чарняўскага за 1975 год) не быў унесены ў спіс [3, с. 150]. Верагодна, гэта звязана з невялікай колькасцю матэрыялаў, атрыманых падчас даследаванняў. У сваю чаргу, пад гэтай назвай у «Зборы» размешчана стаянка Баля Сольная-2 (па справаздачы). У выніку, помнік Баля Сольная-3 (па справаздачы) стаў помнікам Баля Сольная-2 згодна «Збору помнікаў». Гэтая ж інфармацыя патрапіла ў энцыклапедыю па археалогіі і нумізматыцы Беларусі [4, с. 71]. Хаця у якасці шыфра на матэрыялах, якія захоўваюцца ў фондах Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выкарыстоўваецца надпіс «Баля Сольная-III».

Далей гэтую ж нумарацыю працягнуў у сваёй магістарскай працы В. С. Абухоўскі. Пры гэтым ён першы даў верагодную культурную прыналежнасць фінальнапалеалітычных матэрыялаў і аднёс іх з асцярожнасцю да валкушанскай культуры [10, s. 44]. У 2009 годзе выйшла праца пад рэдакцыяй К. Шымчака і Р. Вітаслоўскага, якая была скампанаваная з напрацовак В. С. Абухоўскага. У гэтым выданні таксама падаюцца матэрыялы з помніка Баля Сольная-2, але іх колькасць не супадае з колькасцю, якая размешчана ў магістарскай працы [9, s. 27]. Больш таго, культурная інтэрпрэтацыя часткі матэрыялаў змянілася з валкушанскай на броме-лінгбі. Верагодна, гэта звязана з тым, што ў калекцыі вызначаны наканечнік тыпу Лінгбі. Гэта вельмі цікавы факт, так як В. С. Абухоўскі ў 1998 годзе адзначаў наяўнасць у калекцыі наканечніка тыпу Кашэты [10, s. 44]. Калі супаставіць малюнкі, то становіцца зразумела, што гаворка ідзе пра адзін і той жа артэфакт [9, s.78, tabl. XII, 4; 10, s. 96 tabl. I, 4].

Справа ў тым, што ў канцы XX стагоддзя К. Шымчак выдзеліў перстунскую культуру [11]. Яна лічылася альтэрнатывай культуры броме-лінгбі на тэрыторыі Усходняй Польшчы, Беларусі, часткова Літвы і, паводле яго меркавання, верагодна, была з ёй звязана генетычна [11, s. 187—188]. Адной з прыкмет гэтай адзінкі з'яўляліся наканечнікі тыпу Кашэты, якія адрозніваліся тым, што былі больш далікатнымі ў сваіх прапорцыях, чым наканечнікі тыпу Лінгбі. Пры гэтым даўжыня чаранка ў першага была большая [11, s. 178].

У 2003 годзе выйшаў артыкул В. С. Абухоўскага па праблеме засялення тэрыторыі Беларускага Панямоння ў фінальным палеаліце-мезаліце [12]. У ім адзначаецца, што «прыкладна ў X тысячагоддзі да н. э. з'явіліся тут (на тэрыторыі Беларускага Панямоння — *А. Г.*) плямёны людзей, генетычна звязаных з лінгбійскай культурай, асноўныя помнікі якой знаходзяцца на тэрыторыі Заходняй і Паўночнай Еўропы. З дзейнасцю гэтых людзей на тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі звязаныя паселішчы: Кавальцы I, II; Баля Сольная III (Гродзенскі раён)» [12, с. 183—184].

У гэтай цытаце трэба звярнуць увагу на наступныя моманты: па-першае, нягледзячы на тое, што тэрмін «генетычна звязаны» даволі невыразны, аўтар з асцярожнасцю кажа, што не самі носьбіты культуры броме-лінгбі прыйшлі, а людзі, звязаныя з ёй; па-другое, у тэксце ўзгадваецца не помнік Баля Сольная-2, а Баля Сольная-3 — першапачатковая назва стаянкі. На жаль, малюнак наканечніка ў працы не прысутнічае.

Акрамя таго, у магістарскай дысертацыі В. С. Абухоўскага (табліца № 1, дзе размешчаны наканечнік пад нумарам 4) чамусьці адсутнічае графічнае адлюстраванне таго, што чаранок сфармаваны шляхам утварэння 2 выемак і выдалення праксімальнай часткі нарыхтоўкі [10, s. 96 tabl. I, 4].

Менавіта гэта, на нашу думку, і прывяло да таго, што фінальнапалеалітычныя матэрыялы з помніка Баля Сольная-3 (па справаздачы) былі прылічаны да культуры броме-лінгбі.

Ёсць, канешне яшчэ другі варыянт: магчыма, В. С. Абухоўскі сам аднёс частку калекцыі і, галоўнае, наканечнік, да гэтай культурнай адзінкі. Але нам гэта здаецца малаверагодным па наступных прычынах. Па-першае, ён з’яўляўся высакакласным спецыялістам і не мог ігнараваць тэхніка-марфалагічныя характарыстыкі часткі крамянёвага інвентару, у тым ліку менавіта наканечніка (*гл.* апісанне вышэй). Па-другое, у артыкуле, прысвечаным сучаснаму стану і перспектывам даследавання палеаліту Беларусі, які выйшаў у 2004 годзе, у пераліку помнікаў звязаных з культурай броме-лінгбі ў заходняй часткі краіны, стаянка Баля Сольная-3 (па справаздачы) адсутнічае. Праўда, няма яе і ў спісе помнікаў валкушанскай культуры [13, с. 74—75]. Па-трэцяе, чаранковыя наканечнікі з падобнымі характарыстыкамі ў іншых публікацыях В. С. Абухоўскага не звязваюцца даследчыкам з носьбітамі культуры броме-лінгбі [14, с. 52].

**Заключэнне.** Зыходзячы з аналізу крамянёвага інвентару з помнікаў, выяўленых Міх. М. Чарняўскім у 1975 годзе, можна зрабіць наступныя высновы:

– матэрыялы з помніка Баля Сольная-2 (па справаздачы) нешматлікія і невыразныя, таму могуць быць датаваны каменным—бронзавым вякамі;

– у калекцыі з помніка Баля Сольная-3 (па справаздачы) адсутнічаюць матэрыялы культуры броме-лінгбі. Тэхніка-марфалагічныя характарыстыкі артэфактаў дазваляюць звязваць іх з валкушанскай культурай. Аднясенне гэтых матэрыялаў у літаратуры да броме-лінгбі з’яўляецца вынікам недастатковай крытыкі крыніц;

– акрамя фінальнапалеалітычных матэрыялаў, у калекцыі з помніка Баля Сольная-3 (па справаздачы) прысутнічаюць артэфакты больш позніх эпох: неаліту — бронзавага часу, Сярэднявечча — Новага часу;

– аналіз прывязак помнікаў у розных аўтараў прывёў да высновы, што помнік Баля Сольная-2 (па справаздачы Міх. М. Чарняўскага) — гэта адкрыты В. Л. Лакізай у 2012 годзе помнік Баля Сольная-3; а Баля Сольная-3 (па справаздачы Міх. М. Чарняўскага) — гэта Баля Сольная-2 па літаратуры. Праўда, ёсць верагоднасць, што адкрыты В. Л. Лакізай помнік увогуле з’яўляецца новым, але гэта можна праверыць толькі з дапамогай палявых прац.

## Спіс цытаваных крыніц

1. *Клейн, Л. С.* Отчет обследования стоянок каменного века Славяно-Литовским отрядом Прибалтийской экспедиции в 1958 г. / ЦНА НАН Беларусі. — ФАНД. Воп. 1. Арх. 178. — 23 с., 4 с., фото.

2. *Чернявский, М. М.* Отчет об археологических исследованиях в 1975 г. / ЦНА НАН Беларусі. — ФАНД. Воп. 1. Арх. 513. — 45 с.

3. *Чарняўскі, М. М.* Баля Сольная / М. М. Чарняўскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. — Мінск : БелСЭ, 1986. — С. 150.

4. *Чарняўскі, М. М.* Баля Сольная / М. М. Чарняўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя // Беларуская энцыклапедыя ; рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1993. — С. 71.

5. *Лакіза, В. Л.* Вынікі археалагічных даследаванняў першабытных помнікаў Беларускага Панямоння ў 2012 годзе / В. Л. Лакіза // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — Мінск : Беларус. навука, 2014. — Вып. 25 : Вынікі даследавання першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі ў 2011—2012 гадах. — С. 230—242.

6. *Калечыц, А. Г.* Палеалітычныя помнікі Беларусі: (культурна-храналагічная ідэтыфікацыя крыніц) / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў, В. С. Абухоўкі. — Мінск: Беларус. навука, 2010. — 323 с.

7. *Калечиц, Е. Г.* Проблема первоначального заселения территории Беларуси в свете новых данных (финальный палеолит) / Е. Г. Калечиц // Докл. Нац. акад. наук Беларуси. — 2013. — Т. 57, № 3. — С. 111—114.

8. *Калечиц, Е. Г.* Финальный палеолит на территории Беларуси в свете новых данных / Е. Г. Калечиц, А. В. Колосов // Копытинские чтения — I, II : сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф. / под общ. ред. М. И. Матюшевской. — Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2018. — С. 5—9.

9. *Obuchowski, W.* Materiały paleolityczne i mezolityczne z Zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. — Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2009. — 296 s.

10. *Obuchowski, W.* Schyłkowy paleolit i mezolit prawobrzeżnej strefy dorzecza górnego Niemna: praca magisterska / W. Obuhowski. — Warszawa, 1998. — 168 s.

11. *Szymczak, K.* Kultura perstuńska w paleolicie schylkowym nizu srodkowoeuropejskiego / K. Szymczak // Swiatowit, XXXVIII. — Warszawa, 1991. — S. 143—188.

12. *Абухоўскі, В. С.* Засяленне тэрыторыі Беларускага Панямоння ў X—V тыс. да н. э. / В. С. Абухоўскі // Культура Гродзенскага рэгіёна: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа : навук. пр. / адк. рэд. А. М. Пяткевіч. — Гродна : ГрДУ, 2003. — С. 182—188.

13. *Абухоўскі, В. С.* Палеаліт Беларусі — сучасны стан і перспектыва даследаванняў / В. С. Абухоўскі // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski / Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego ; red.: A. Kośko, A. Kalečyc. — Warszawa, 2004. — S. 67—79.

14. *Калечиц, Е. Г.* Этапы заселения мотольского микрорегиона в каменном и бронзовом веках: по материалам поселения Мотоль-17 / А. Г. Калечиц, В. С. Обуховский // LA. — 2004. — Т. 25. — P. 45—78.

Паступіў у рэдакцыю 11.05.2023.